# Бацькаўшчына

WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND“ Цана 1 н. м.

№ 10 (13) 4 красавіка 1948 г. год выданьня 2


# «ХАЛОДНАЯ ВАЙНА»

## ТРЫЕСТ — ІТАЛІІ

### ПРАПАНОВА ТРОХ ДЗЯРЖАВАЎ

**Турын (ДЭНА).** Францускі міністар замежных справаў Бідо заявіў, што Францыя, Вялікабрытанія й ЗША згадзіліся зьвярнуць Італіі акругу Трыесту й пастанавілі паразумецца ў гэтым пытаньні із СССР.

**Парыж (ДЭНА).** Паводля АФП, брытанска-француска-амэрыканская нота ў справе Трыесту перададзеная савецкаму паслу ў Парыжы.

**Нью-Ёрк (ДЭНА-ІНС).** Амэрыканскі дэлегат у Радзе Бясьпекі перадаў генэральнаму сакратару ЗН супольную просьбу Вялікабрытаніі, Францыі й ЗША да Рады Бясьпекі ўхваліць зварот Трыесту Італіі.

**Белград (ДЭНА).** Югаслаўскі міністар замежных справаў Сіміч, паводля АФП, заявіў, што Югаславія гатовая імкнуцца да згоды ў справе Трыесту ў духу перамоваў, што адбыліся між югаслаўскім прэм'ер-міністрам Тыто й генэральным сакратаром італьлянскае камуністычнае партыі Тальяты.

**Масква (ДЭНА-Рэйтар).** Савецкая прэса апублікавала поўны тэкст брытанска-француска-амэрыканскае прапановы ў справе звароту Трыесту, а таксама югаслаўскі адказ, паводля якога Югаславія гатовая да перамоваў.

### ЗУСІМ НЕ МАНЭЎР

**Лёндан (ДЭНА).** Міністар замежных справаў Бэвін заявіў у парлямэньце, што не адпавядае праўдзе, быццам прапанова зьвярнуць Трыест Італіі зроблена з увагі на італьлянскія выбары 18 красавіка. «Я не закідаў Савецкаму Саюзу ніякага «выбарнага манэўру», калі ён запрапанаваў быў зьвярнуць Італіі калёніі, і памойму, ня трэба й мяне вінаваціць у падобных мерапрыёмствах», — сказаў міністар.

На пытаньне лейбарыстускага дэпутата Драйбэрга, ці ўсім тым вялікім дзяржавам, якія, здаецца, мяшаюцца ў італьлянскія выбары, ня лепш было-б пачакаць яшчэ тыдні тры, каб яшчэ больш не завайстраць і так ужо далікатнага міжнароднага палажэньня, Бэвін адказаў пад усеагульныя воплескі, што гэтае пытаньне можна было-б скіраваць Маскве.

Падзеі апошніх месяцаў паказалі, — сьцьвердзіў Бэвін пад воплескі, — што вызначэньні мірнае ўмовы пра стварэньне вольнага гаспадарства Трыесту зрабіліся няўжыцьцёўлівымі.

## ПЕРАСТАНОВА ЗША

### ЗАМІЖ ПАДЗЕЛУ — ДАВЕРНІЦТВА

**Нью-Ёрк (ДЭНА).** Амэрыканскі дэлегат на пасяджаньні пяцёх сталых сябраў Рады Бясьпекі афіцыйна паведаміў, што ЗША адмаўляюцца ад падтрыманьня пастановы пра падзел Палестыны й заміж гэтага прапануюць часовае даверніцкае кіраўніцтва для цэлае Палестыны. Дэлегаты Кітаю й Францыі заявілі, што яны падтрымваюць амэрыканскую прапанову, тымчасам як савецкі дэлегат Грамыка сказаў, што прапанова стаіць у супярэчнасьці з рэзалюцыяй агульнага зьезду ЗН, і ён ня можа канчальна заняць становішча, пакуль не дастане далейшых інструкцыяў ад свайго ўраду.

### ЗАРОДАК НОВАЕ ВАЙНЫ

**Вашынгтон (ДЭНА-ІНС).** Амэрыканскі міністар замежных справаў Маршал заявіў сэнатарам, што ЗША адмовіліся ад падтрыманьня пляну падзелу Палестыны, бо праведзеньне яго магло-б разьвязаць новую вайну.

### ТРУМАН ПРАПАНУЕ

**Вашынгтон (ДЭНА-Рэйтар).** Прэзыдэнт Труман у прамове перад абедзьвюма гасподамі амэрыканскага кангрэсу падаў тры прапановы й прасіў кангрэс як мага барджджэй разгледзець іх. Прэзыдэнт прапануе: прысьпешыць ухваленьне праграмы эўрапейскае адбудовы, безадкладна прыняць законапраекты пра ўсеагульнае вайсковае вышкаленьне й часова аднавіць усеагульны вайсковы абавязак у ЗША.

### СУСЬВЕТНАЕ ЗМАГАНЬНЕ

**Бэркэлей (Каліфорнія — ДЭНА - Рэйтар).** Міністар замежных справаў ЗША Маршал у прамове пра міжнароднае палажэньне заявіў, што нагвалт патрэбнае безадкладнае амэрыканскае наважаньне ў сучасным «сусьветным змаганьні між свабодай і тыраніяй». Ніколі дасюль у гісторыі палажэньне ў Эўропе не пагражала гэтак моцна амэрыканскім ідэалам і інтарэсам, — заявіў міністар.

### ЧЭХАСЛАВАЧЧЫНА — НА РАДЗЕ БЯСЬПЕКІ

**Нью-Ёрк (ДЭНА-Рэйтар).** На прапанову Чылі, падтрыманую 9 галасамі супраць 2 (СССР і Украіны), Рада Бясьпекі ЗН разглядае справу Чэхаславаччыны.

### ЗРАЗУМЕЛАЯ МОВА

Хто ня слухае, той мусіць адчуць. Дзеці вучацца гэтага правіла, ды толькі занадта часта вельмі балючая навука добрых правілаў не даходзіць да неслухаў. Тады факты, балючыя факты, куты й канты суровае запраўднасьці даводзяць да канца тое, чаго ня здолелі зрабіць аргумэнты, сьцюдзёнае пераконваньне, угаворваньне і ўмушчаньне.

І ў вялікай палітыцы не заўсёды памагаюць ясныя рэчы. Напару бывае й тут вельмі мулкае абуджэньне зь лятуценнага сьвету прыгожых зданяў. Прэзыдэнт Гары Труман у сваім нядаўным звароце да кангрэсу ўпяршыню выразна выясьніў, што шлях Саветаў у сваім дасюлешнім кірунку мусіць давесьці да вайны. Гэта суровая мова фактаў. Калі-б Саветы думалі, што час гаворак яшчэ ня скончыўся, дык цяпер яны лепш ведаюць гэта.

Аднак, зусім тугім амэрыканскі міністар абароны Джэмс Форэсталь прыпомніў яшчэ зусім дакладную й вельмі кантаватую рэальнасьць. **ЗША**, сказаў ён, могуць вырабляць **атомныя бомбы**, а **Савецкі Саюз** яшчэ не. Таму рэальнасьць атомнае бомбы ў амэрыканскіх руках значыць: забясьпечаны мір. Бо што ЗША не злажываюць атомнай бомбай, давала мінуўшчына. Калі-б ЗША хацелі мець вайну, яны яе даўно мелі-б і — маглі-б выйграць. Будучыня напэўна прынясе нападніку, далакопу свабоды шырокага кола народаў — самому дол магільны.

Усё-ткі яшчэ не запозна. Адзін нямецкі карэспандэнт папытаўся ў генэрала Л. Д. Клея, амэрыканскага вайсковага губэрнатара Нямеччыны, на ягонай апошняй прэсавай канфэрэнцыі ў Франкфурце, ці запраўды вайна пад дзьвярыма, бо шмат Немцаў агортае ваенны страх. Генэрал адказаў: «Ніхто ў сьвеце ня хоча вайны, і кажны не баіцца. Аднак, із другога боку, ёсьць пэўныя маральныя вартасьці, якія мы, верачы ў гэткія вартасьці, пры ўсіх абставінах высака цэнім. Мы ня маем права спалохацца перад тым, каб ужыць мерапрыёмствы дзеля абароны гэтых вартасьцяў».

Да зброяў, якімі саветы майстроўска працуюць, належыць пашырэньне **страху й жахаў**. Сталін, як даводзяць ягоныя гутаркі з Рузвэльтам і Чэрчылем, сьведама выкарыстоўваў, як палітычную зброю, паралізуючую жудасьць, што бегла наперадзе, папярэджаючы ўварваньне савецкіх войскаў, і гэтым, прыкладам, дасягнуў дабраахвотных уцёкаў вялікага ліку Немцаў з таго боку Одры й Нісы. На выпадак завойстраньня супярэчнасьцяў, што залежыць адно ад савецкага захоўваньня — ЗША ня вылучаюць аніводнае дзяржавы із супрацоўніцтва ў справе міру — тыя, што знойдуцца на баку ЗША, маюць усю аснову для аптымізму. Ужытыя ўжо аднойчы ў газэце «Die Neue Zeitung» словы **«ня бойцеся!»** — усё яшчэ маюць сваё значаньне. Выстачальная вайсковая сіла, і воля, і магутнасьць, каб бараніць свабоду — гэта словы, якія ўсюды, і ў Маскве, зразумеюць. Побач із расейскім, так часта ўжываным савецкім міністрам замежных справаў Молатавам, словам **«нет»** — гэта можа навет адзіныя словы тае мовы, якой можна гутарыць із Крамлём.

(Рэдакцыйная зацемка «Die Neue Zeitung» — амэрыканскае газэты для Немцаў).

### АПОШНІМ ЧАСАМ

— Радыё Масквы афіцыйна запярэчвае знаходжаньне савецкіх падводных чоўнаў ля ціхаакіянскага узьбярэжжа ЗША.

— Вашынгтон катэгарычна запярэчыў чуткі пра магчымую сустрэчу Трумана, Этлі й Сталіна.

— Турэцкі прэм'ер-міністар інспэктуе турэцка-армянскую мяжу.

— Маршал Чан-Кай-Шы адчыніў першае ў гісторыі паседжаньне кітайскага парлямэнту.

# ЗА ПРАПАГАНДУ НАВОНКІ

Ужо больш за тры гады вялікі лік беларускага народу жывецъ за межамі Бацькаўшчыны. Калі гэтая маса зразумела, усьведаміла й пастанавіла імя выгнанца ўзьняць да годнасьці змагара, — змагароў за свой народ і Бацькаўшчыну, дык трэба радыкальна зьмяніць дасюлешнія дачыненьні й пачаць запраўды актыўную дзейнасьць. Могуць сказаць, што прынамся вялікая частка нас уцякала з свайго роднага краю, найбольш думаючы аб ўратаваньні свае собскае бясьпекі, чымся аб адваяваньні волі ўсяму нашаму народу й зямельцы. Дык калі мы хочам быць роўнымі з тымі братамі, якія на родных палетках цягнуць ярмо акупацыі й вядуць зь ім магчымае змаганьне — мусім і мы жыць гэтак, каб на перцым месцы стаялі абавязкі й заданьні, якія беспасярэдня датычаць нашага народу й ягонага існаваньня, нашае дзяржавы й ейнае незалежнасьці.

Каб усьцерагчыся непаразуменьняў, трэба падчыркнуць, што мы не маглі заставацца на Бацькаўшчыне з усім ведамых прычынаў і з тых-жа прычынаў ня можам туды вяртацца. Добра, што сяньня на чужыне ёсьць нас ладная колькасьць, але гэта можа мець вагу толькі тады, калі запраўды праводзіцца праца, якое ад нас патрабуе наш паняволены народ і Бацькаўшчына. Тут-жа яшчэ хочацца падчыркнуць, што не ад нас, але ад тых братоў, якія пакутуюць на акупаванай Бацькаўшчыне й вядуць змаганьне з акупантамі, паўстане найперш воля й незалежнасьць Бацькаўшчыны. Але мы, што апыніліся за межамі, павінны ўнесьці сваю долю, і сяньня гэтую магчымасьць маем толькі мы.

Не закранаючы тых заданьняў, якія прыпадаюць нашым выгнанскім арганізацыям у ўзмацненьні нашае собскае сьведамасьці, нацыянальнае культуры й асьветы, замацаваньні й абароне правоў, самадапамогі й самападтрыманьня, асаблівую ўвагу трэба ўзяць да пытаньняў інфармацыі й прапаганды нашае справы. Гэтую працу нельга правесьці ў нашым собскім асяродзьдзі, гоні ёй трэба знайсьці паміж іншых народаў, і да таго гэтак, каб узьдзеяць эфэктыўна. Дасюль у нас на гэта мелі мала ўвагі. Пытаньне гэтае, праўда, не закінутае, але стаіць не даволі высака. І сяньня, нажаль, мы не пасунуліся далей, чымся першымі часамі выгнаньня. Зразумела, усё гэта мела шмат і розных прычынаў, часткава апраўданых, але пераважна не. Ясна, што інфармацыйная праца, каб яе належна паставіць, патрабуе ладных серадкоў. Нашыя асяродкі іх мелі (а на што яны былі скарыстаныя?), і сяньня мы іх мусім знайсьці. Другое, патрэбныя ўмелыя й сьведамыя працаўнікі, дзесяткі працаўнікоў, а магчыма і ўся сотня. Найперш — гэта арганізацыйнае пытаньне, якое трэба разьвязаць станоўка й хутка, у ніякім разе не пакідаючы яго на самаплынь. Важнейшае за інфармацыйную прапагандавую працу на сяньня мы ня маем, а праблема эміграцыі таксама толькі другарадная, бо мы-ж ня эмігруем адно таму, каб знайсьці спакойны куточак і мяшчанскую ўтульнасьць ды сумленнай працай зарабіць сабе на існаваньне, але толькі дзеля таго, каб выканаць тыя заданьні, якія мы павінны выканаць для нашага народу й дзяржавы. Гэтак мусіць зрабіць кажны, хто мае сябе за сьведамага змагара.

Запраўды, дзіўна й прыкра, калі мы самі можам канстатаваць, што аб гаспадарскіх і палітычных магчымасьцях Беларусі, аб нашых дасягненьнях за час паміж дзьвюма войнамі, аб нашым змаганьні за волю й незалежнасьць, аб акупацыях нашае Бацькаўшчыны і аб нашым адпорна-вызвольным руху ў сьвеце надзвычай мала ведаюць, навет сярод народаў, якія мы маем за сяброўскіх і прыязных сабе. Мы сяньня ня можам быць пэўнымі, ці ў недалёкай будучыні не адбудуцца новыя спробы падзелу нашае Бацькаўшчыны паміж нашымі суседзямі й ці гэта ня прызнаецца аднэй-другой вялікай дзяржавай Захаду. І калі-б гэта адбылося, дык уся адказнасьць ляжа на нас самых і толькі на нас, бо ў нас сяньня блізу зусім незарганізаваны інфармацыйны апарат. Гэта запраўды толькі нястача арганізацыі, калі мы гэтага яшчэ ня маем, бо сярод нас даволі здольных і абазнаных з гэтаю працаю людзей, якія часам працуюць навет на чужынцаў. Будзе няправядліва, калі віну за гэта мы паспрабуем сьпіхнуць на некага аднаго, хто над гэтым працаваў ці працуе сяньня. Гэта — заданьне й абавязак усяе нашае эміграцыі. Зразумела, праца мусіць падпарадкавацца аднаму цэнтру й ім кіравацца. Мы маем даволі серадкоў і шмат розных магчымасьцяў, каб паказаць і высьвятліць бальшавіцкую няволю таму замежнаму грамадзянству, якое ў будучыні будзе нам вельмі ва-

жным. У цяперашняй міжнароднай сытуацыі аб нашай праблеме і аб усім, што ў сувязі з гэтым, зацікаўленьня і ўвагі досыць.

А што практычна зроблена дагэтуль? — Надзвычай мала, каб над гэтым шырэй спыніцца. Тыя нялічныя выданьні ў замежных мовах аб Беларусах і Беларусі зусім нязначныя, калі-б мы захацелі бачыць у іх плод нашае інфармацыі й прапаганды. Апрача таго, бадай няведама, каб нешта выдалі ў нямецкай, францускай, гішпанскай ці нейкай іншай мове. Трэба зазначыць, што зусім няма патрэбы за кажным разам выдаваць цэлую кніжку. Для нашае прапаганды было-б даволі, каб больш-менш рэгулярна выдаваць нейкія бюлетэні. Мы не павінны забыцца й выданьняў у нямецкай мове, бо раней ці пазьней трэба лічыцца з тым, што нямецкі народ будзе выдатным фактарам у змаганьні супраць экспансіі бальшавізму.

Побач із рознымі выданьнямі ў выглядзе кніжак, брашураў і пад., трэба асабліву ўвагу узяць на беларускі друк, асабліва на наш выгнанскі друк. Нашыя працаўнікі друку, хоць яны наагул і належаць да найактыўнейшых і нацыянальна найсьведамейшых працаўнікоў на выгнаньні, аднак дагэтуль ня выявілі належнае ўвагі да інфармацыйнае й прапагандавае працы. Адно ясна, што ад нашых выдацоў мы можам чакаць у гэтай галіне больш працы. Ці-ж мы не маглі-б выдаваць ад часу да часу бюлетэні ў ангельскай, францускай, нямецкай ці нейкай іншай мовах? — Зразумела, гэтыя выданьні мусілі-б быць пастаўленыя на «эўрапейскую нагу». Але гэта не праблема, разьвязаньне яе гарантуе склад нашае эміграцыі. Здаецца, і ў серадкох ня было-б запыну. І калі-б гэтыя выданьні мы пасьля пашыралі-б у некаторых краёх ці, прыкладам, выслалі-б іх усім сябрам амэрыканскага кангрэсу, міністрам урадаў Ангельшчыны й Францыі, усім некамуністычным дэпутатам парлямэнтаў і розным грамадзкім арганізацыям, ці-ж гэта ня была-б прапаганда беларускае справы, ці гэта ня было-б змаганьне за волю, права й незалежнасьць нашае Бацькаўшчыны? — Гэтае самае можна сказаць і аб нашых выдавецтвах. Было-б вельмі карысна й навет канечна, каб яны выдавалі нешта і ў чужых мовах. Мелі-б значэньне й выданьні нашае літаратурнае працы, якія навет ужо ляжаць гатовымі да друку. Прынцыпова аб гэтым навет гаварыць бадай ці трэба.

Трэба памятаць і яшчэ адзін вялікі серадок прапаганды — радыё. Важна было-б ведаць, ці недзе спрабавалі ўмаўляцца з дырэкцыямі радыёфонаў аб зарганізаваньні беларускіх перадачаў? Некаторыя іншыя народы гэтага дасягнулі. Мастацкія перадачы адначасна з кароткімі зацемкамі аб Беларусі й Беларусах трэба ўважаць за бездакладнае заданьне нашых дзён, і гэтага мусім дасягнуць.

Затым — замежны друк. Дагэтуль у газэтах заходніх дэмакратыяў надзвычай рэдка сустракаюцца весткі аб Беларусі, аб нашай праблеме і аб усім, што ў сувязі з гэтым. Аб гэтым было ўжо ці раз гаворана, але практычна ніякіх вынікаў няма. Трэба спытацца, ці гэткае палажэньне, наколькі яно залежыць ад нас самых, можам допусьціць і надалей? — Гэты абавязак кладзецца на нашыя собскія плечы, і мы яго мусім хутка й дакладна разьвязаць, тым больш, што асаблівых выдаткаў гэта не патрабуе.

Гэтыя прыклады паказваюць, што працы мы маем бязьмежна шмат. Патрэбная сувязь і з родным краем, каб у братоў пад бальшавіцкім панаваньнем ня зьнікала вера ў дзень волі і каб ім стала сілы, вытрываласьці й адпору.

Вось нашыя бездакладныя заданьні й абавязкі сяньня, бо гэтага ня зробіць за нас ніхто іншы, і ня людзі карыта з нашага собскага асяродзьдзя, якія толькі былі спрытнымі панапіхаць кішэні кавай і за гэтую каву панацягаць у залежнасьць ад сябе розных людзей зь нямоцнай яшчэ (ці хісткай наагул) асабістай паставай.

Дык-жа бярэмся за працу пільна й заўзята!

**Паддубіч.**

### ЭЎРАПЕЙСКАЯ ВУНІЯ СТВОРАНАЯ

**Брусэль (ДЭНА-Рэйтар).** Міністры замежных справаў Вялікабрытаніі, Францыі, Бэльгіі, Галяндыі й Люксэмбургу падпісалі пяцьдзесятгадовы пакт пяцёх гаспадарстваў заходня-эўрапейскае вуніі. Пакт мае ўступ і 10 артыкулаў ды прадугледжвае, апрача эканамічнага супрацоўніцтва, узаемнае вайсковае падтрыманьне ў межах 51-га артыкулу Хартыі Задзіночаных Нацыяў. Дзеля рады ўва ўсіх пытаньнях, якія зьмяшчае пакт, ствараецца сталы кансультацыйны камітэт.

**Лёндан (ДЭНА-Рэйтар).** Брытанскі прэм'ер-міністар Этлі ў парлямэнце зазначыў, што падпісаны ў Брусэлі пакт пяцёх не скіраваны супраць якога-небудзь іншага краю. Чэрчыль, як лідэр апазыцыі, таксама прывітаў пакт.

### САВЕТЫ БРАЗГАЮЦЬ ДЗЬВЯРЫМА

**Бэрлін (ДЭНА).** Савецкая дэлегацыя дэманстрацыйна й зусім неспадзявана для іншых дэлегацыяў пакінула 82-е паседжаньне Саюзнае Кантрольнае Рады, пасьля таго, як праведзеныя перад гэтым у вайсковых колах спрэчкі пра лёнданскую нараду трох і праскі мэмарандум міністраў замежных справаў Польшчы, Югаславіі й Чэхаславаччыны не давялі да ніякага выніку. Маршал Сакалоўскі ў доўгой заяве абвінавадзіў вайсковых губэрнатараў заходніх зонаў у «пашкоджаньні й разбурэньні» ўмовы чатырох дзяржаваў. Тым самым, сказаў ён, Кантрольная Рада, як урадавы орган, ня йснуе больш.

# Рэха Сакавіка

Падаём найважнейшыя з надасланых нам беспасярэдня й нашымі нацыянальнымі арганізацыямі сакавіковых прывітаньняў.

### БЕЛАРУСКАМУ НАЦЫЯНАЛЬНАМУ ЦЭНТРУ (БНЦ)

Беларускі Народ сьвяткуе сяньня трыццацігодзьдзе аднаўленьня Самастойнае Беларускае Дзяржавы, Беларускае Народнае Рэспублікі, у зацяжным змаганьні з бальшавіцкім тыраніяй.

У гэтыя ўрачыстыя ўгодкі, калі зьдзейсьніліся лятуценьні найлепшых сыноў і дачок Беларускага Народу, Камітэт Антыбальшавіцкага Блёку Народаў (АБН) шчыра-сяброўска вітае Беларускі народ у ягоным гэраічным змаганьні за свабоду, за Самастойную — ад нікога незалежную — Беларускую Дзяржаву на ўсёй беларускай зямлі й складае Беларускаму Народу найсардэчнейшыя зычэньні якнайбарджэйшага дасягненьня ягонае мэты!

І калі сяньня адно ў падзямельлях змаганьня можа Беларускі Народ сьвяткаваць Вялікія Ўгодкі, калі ў гэты дзень беларускія рэвалюцыянэры-паўстанцы сваёй крывёю асьвячваюць родныя баёвыя сьцягі, — мы, паняволеныя таксама, як і Беларускі Народ, расейска-бальшавіцкім таталітарызмам народы заяўляем нашую нязломную рэвалюцыйную салідарнасьць зь неспакораным, волялюбным Беларускім Народам у ягоным змаганьні за волю.

Мы стаём згуртавана за Беларускую Самастойную Дзяржаву, гаспадарства народу, што ніколі ня склаў і не складзець сваіх сьцягоў, не зважаючы на жахлівыя ахвяры крыві, якія панёс Беларускі Народ у сваім, што трывае стагодзьдзі, змаганьні супраць расейскага імпэрыялізму — за распадзел расейскае імпэрыі на нацыянальныя гаспадарствы ўсіх народаў.

Аддаючы пашану гэраічнаму змаганьню Беларускага Народу, асабліва ягоных паўстанскіх аддзелаў, рэвалюцыйнага авангарду, — мы клічам у Вялікія Ўгодкі Беларусі:

Няхай жыве харобры Беларускі Народ!

Няхай жыве Самастойная — ад нікога незалежная — Беларуская Нацыянальная Дзяржава!

Няхай жывуць гэраічныя беларускія рэвалюцыянэры-паўстанцы!

Няхай жыве супольны фронт паняволеных бальшавізмам і расейскім імпэрыялізмам народаў!

25 сакавіка 1948 г.

**Старшыня**
**Камітэту Антыбальшавіцкага Блёку Народаў (АБН)**

### ПРЭЗЫДЫЮМУ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ЦЭНТРУ (БНЦ)

З нагоды трыццатых угодак абвешчаньня Незалежнае Беларускае Дзяржавы, Замежнае Прадстаўніцтва Украінскае Галоўнае Вызвольнае Рады перасылае найлепшыя пажаданьні ўсяму Беларускаму Народу й ягонаму Праваднірству. Мы шчыра вітаем гэраічны Беларускі Народ, што трыццаць год таму ўзьняў сьвятары сьцяг свабоды й незалежнасьці ды вытрываў пры ім да сяньня, у бязупынным змаганьні супраць найбольшага ворага чалавецтва — маскоўска-бальшавіцкага імпэрыялізму. Мы асабліва сардэчна віншуем і зычым удачаў тым сыном і дочкам Беларускага Народу, што ў сучасным мамэнце стаяць у супольных радох змаганьня із змагарамі іншых народаў Усходу ды імкнуцца да ўжыцьцёўленьня супольных нацыянальных ідэалаў паняволеных народаў.

Адначасна, у дні Вашага нацыянальнага сьвята мы лучымся думкамі з Вамі й з усім Вашым народам ды замацоўваем у сабе глыбокую веру ў неразлучнае сяброўства нашых народаў, што, прайшоўшы неаднакраць супольнымі шляхамі сваю велічную гістарычную мінуўшчыну, сяньня змагаюцца ў вадным фронце супраць супольнага ворага, а ў недалёкай будучыні зажывуць, як добрыя суседзі, у собскіх незалежных дзяржавах, пабудаваных на іхных этнаграфічных тэрыторыях. Мы выказваем нашае глыбокае перакананьне ў тым, што адно нашымі супольнымі сіламі й сіламі іншых паняволеных народаў можа быць зьнішчаны маскоўска-бальшавіцкі імпэрыялізм і адначасна мы ведаем, што адно пры сьцiслым супрацоўніцтве абодвух нашых народаў, у верным сяброўсьцьве іхных незалежных самастойных дзяржаваў можа быць пастаўленая паважная запона ўсякаму імпэрыялізму на ўсходзе й забясьпечаны трывалы мір. Таму ў дні Вашага Вялікага Сьвята мы клічам:

Няхай жыве вечнае сяброўства й хаўрус беларускага і ўкраінскага народаў у іхных незалежных дзяржавах!

Няхай мацнее супольны фронт нашага змаганьня супраць супольнага ворага й за ўжыцьцёўленьне супольных ідэалаў!

Няхай жыве Беларускі Народ!

**Прэзыдыюм Замежнага Прадстаўніцтва УГВР.**

### РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ «БАЦЬКАЎШЧЫНА»

Глыбакапаважаны сп. Рэдактар!

Дазвольце мне, ад імя грузінскае калёніі, з нагоды споўненьня трыццацігодзьдзя абвешчаньня незалежнасьці Беларускага Гаспадарства выказаць Беларускаму Народу свае віншаваньні й зычэньні ўдачы ў гэраічным змаганьні за сваю нацыянальную незалежнасьць супраць маскоўскага імпэрыялізму.

Няхай жыве вольная, незалежная дэмакратычная Беларусь!

Няхай жыве цесны хаўрус усіх паняволеных і прыгнечаных бальшавіцкай тыраніяй народаў!

З глыбокай пашанай,
**Старшыня Грузінскае Калёніі**
**А. Кордзайя.**

Мюнхэн, 24. 3. 48.

### БЕЛАРУСКАМУ (КРЫВІЦКАМУ) ЦЭНТРАЛЬНАМУ ДАПАМАГОВАМУ КАМІТЭТУ У НЯМЕЧЧЫНЕ

25-га сакавіка 1948 г. мінае 30 год з дня адраджэньня дзяржаўнасьці Крывіцкага Народу. У дзень гэтых гордых і слаўных угодкаў мы — **Украінцы, сябры Саюзу Гетманцаў-Дзяржаўнікаў**, сардэчна вітаем Крывіцкі народ, што сяньня, нароўні зь іншымі народамі, гэтак жорстка паняволенымі бальшавізіяй, змагаецца за сваё месца на зямлі, за сваю Незалежную Дзяржаву.

Вы, Крывічы, як і мы, Украінцы, ніколі ня былі захопнікамі чужых земляў, ніколі не гнялі іншых народаў. Ня хочам мы і ў будучыні быць захопнікамі.

Мы хочам жыць вольна на вольнай ад гвалту й тыраніі зямлі, сярод вольных народаў.

У гісторыі Крывіцкага і Ўкраінскага Народаў ёсьць шмат супольнага. Даўгія гады нашыя краі вынішчаў царат. Блізу што разам із Вашым Дзяржаўным Адраджэньнем сталася 29-га красавіка 1918 г. Украінскае Дзяржаўнае Адраджэньне. Блізу што адначасна тыраністычная бальшавізія паняволіла нашыя народы й вынішчае нашую дзяржаўную культуру.

Народ наш ня ўпаў перад захопнікам. Мы адно выйшлі зь няроўных заградак. Перабудуем нашыя рады, дамэтна расставім нашыя аванпосты й рэзэрвы, і з дапамогаю цывілізаванага сьвету ЭЎРОПЫ Й АМЭРЫКІ пойдзем на канчальнае вызваленьне нашых земляў.

Чэсьць і Слава Крывіцкаму Народу!

ШЧАСЬЦІ ВАМ БОЖА!

З глыбокаю й сардэчнаю пашанаю да Вас,
праф. **Андрый Маскаленка.**

24 сакавіка 1948 г.

### БЕЛАРУСКАМУ ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ

Да трыццатых угодкаў абвешчаньня Беларускае Народнае Рэспублікі просім прыняць выказаньні найсардэчных сымпатыяў ад казацкага народу.

На працягу трыццацёх год беларускі народ бязупынна змагаецца за сваю свабоду й незалежнасьць, за свае неадымнае права на собскае нацыянальнае жыцьцё. У гэтым гэраічным змаганьні ён панёс вялізарныя страты, якія налічаюцца міліёнамі лепшых ягоных сыноў. Аднак, беларускі народ ні на часіну не адмаўляўся й не адмаўляецца ад свайго прыроднага права, змагаючыся цяпер у супольным фронце ўсіх паняволеных і прыгнечаных народаў цэнтральнае і ўсходняе Эўропы.

Із цьвёрдай і непахіснай верай у трыумф сьвятарнага змаганьня беларускага народу зычым ад усяе душы поўнае ўдачы ў ягонай вызвольнай працы, што вядзецца ў цесным супрацоўніцтве зь іншымі народамі, якія сталіся ахвярамі бальшавіцкага гвалту.

**Казацкае Народнае Прадстаўніцтва.**

### ПРЭСА ДП ДА САКАВІКА

Дасюль паводля нашых дадзеных на трыццацігодзьдзе абвешчаньня незалежнасьці Беларусі адгукнуліся наступныя часапісы ДП: «Українська Трибуна», «Неділя» — украінскія й польская «Кроніка». Асабліва цёпла адгукнулася «Українська Трибуна», якая, побач з артыкулам Я. Каранеўскага, надасланым зь беларускіх колаў, зьмясьціла вялікі й надзвычай цёплы артыкул «Синьоока сестра України», а таксама ведамы верш У. Дубоўкі «О Беларусь, мая шыпшына» ў перакладзе Яр. Славутыча.

### ПАДЗЯКІ

**Мы атрымалі ад нашых нацыянальна-палітычных і дапамаговых арганізацыяў — Беларускага Нацыянальнага Цэнтру (БНЦ), Цэнтральнага Беларускага Дапамаговага Камітэту ў Нямеччыне й Акруговага Камітэту на Амэрыканскую Зону — просьбы перадаць праз нашую газэту шчырую падзяку ўсім тым арганізацыям і асобам, што прывіталі гэтыя арганізацыі ў дзень трыццатых угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі.**

**Із свайго боку, рэдакцыя «Бацькаўшчыны» таксама шчыра дзякуе ўсім тым, хто прывітаў яе з сакавіковым сьвятам, асабліва-ж: Грузінскай калёніі ў Мюнхене, Згуртаваньню Беларусаў у Вялікабрытаніі, Генэральнай Радзе Саюзу Беларусаў у Бэльгіі, Беларускаму Дапамаговаму Камітэту на Ангельскую Зону, скаўцкаму штабу штандару «Баварыя», Цэнтралі Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў на Чужыне, сп. сп. Усеваладу Боеву, А. Ружанцу-Ружанцову, Сяргею Ходу й інш.**

### ШЧЫРАЕ БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯКУЙ

Беларускі Лягер у Остэргофэне ў дзень нашага найвялікшага нацыянальнага Сьвята 25-га Сакавіка атрымаў цэлы рад прывітаньняў ад наступных беларускіх установаў і асобаў: ад Беларускага Дапамаговага Камітэту на Ангельскую зону Нямеччыны, ад Беларускага Дапамаговага Камітэту на Амэрыканскую зону Нямеччыны, ад Згуртаваньня Беларусаў у Вялікабрытаніі, ад Каманданта Беларускага Лягеру ў Міхэльдорфе сп. Б. Шчорса, ад Каманданта Беларускага Лягеру ў Віндышбэргэрдорфе сп. М. Скабея, ад Кіраўніка беларускае нацыянальнае групы ў Шляйсгайме сп. інж. М. Гарошкі, ад Старшыні Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Мітэнвальдзе сп. Я. Грушчыка, ад Кіраўніка Беларускіх Скаўтаў на чужыне сп. В. Панцэвіча, ад сп. А. Махноўскага.

Усім вышэй пералічаным установам і асобам ад імя Беларускага Лягеру ў Остэргофэне на гэтым месцы складаю шчырае беларускае дзякуй.

**Камандант Беларускага Лягеру ў Остэргофэне.**

# СПРАВЫ ДП

### РЭФОРМА ПРЭСЫ ДП

Галоўная Гаспода Амэрыканскіх Узброеных Сілаў у паразуменьні з Галоўнаю Гасподаю IPO правяла рэ**форму** прэсы ДП, паводля якое: 1) **беларускай прэсе захаваныя ліцэнзіі паранейшаму на 1 газэту й 1 часапіс («Бацькаўшчына» й «Сакавік»)**, 2) Украінцам зацьверджаныя 3 газэты («Час», «Неділя», «Українські Вісти») і 3 часапісы («Пу-Гу», «Іжак» і «Молоде Життя»), зачыненыя 2 газэты («Українська Трибуна» і «Наше Життя») і 1 часапіс («На чужині»), 3) Палякам зацьверджаныя 2 газэты («Kronika» і «Lech») і 3 часапісы («Slowo katolickie», «Przeglad literacki» і «Szlak»), 4) Расейцам зацьверджаныя 2 газэты («Эхо» і «Посев») і 1 часапіс, зачыненая 1 газэта («Новости»), 5) Сербам зацьверджаная 1 газэта («Слога») і 2 часапісы, 6) Летувісам зацьверджаныя 2 газэты, 3 часапісы, зачыненая 1 газэта, 7) Эстонцам зацьверджаныя 2 газэты, 3 часапісы, зачыненая 1 газэта, 8) Латышом зацьверджаныя 3 газэты, 2 часапісы, зачыненыя 4 часапісы, 9) Калмыком зацьверджаная 1 газэта («Обозрение» ў расейскай мове). Апрача таго, Латышом дадзена 2 ліцэнзіі на часапісы бяз прыдзелу паперы зь IPO, а Эстонцам — на 1 часапіс бяз прыдзелу паперы. Ліцэнзіяваныя таксама 2 міжнацыянальныя газэты: «DP-Express» і «Im Ausland».

IPO забясьпечвае ад сябе прыдзел паперы на газэты й часапісы з гэткім тыражом: Палякам — 40 тыс. на тыдзень, Латышом — 24 тыс., Украінцам — 22 тыс., Летувісам — 14 тыс., Эстонцам — 10.500, Сэрбам — 9.500, **Беларусам — 5 тыс.**, Расейцам — 4 тыс., Калмыком — 1 тыс. на тыдзень. Прыдзел паперы вызначаны прапарцыянальна да зарэгістраванае колькасьці эмігрантаў. Беларусы, як і часткава Украінцы, шмат пацярпелі на тым, што вялікі лік грамадзянаў тут залічаны да іншых нацыянальных групаў на аснове тагаспадарстваўскае, а не нацыянальнае прыналежнасьці. Усе захады ў гэтай справе тымчасам не далі вынікаў.

Зачыненыя выданьні могуць спрабаваць дамагчыся аднаўленьня ліцэнзіі, падаўшы пасьветчаньне пра прыдзел паперы зь іншых крыніцаў, а ня зь IPO. Гэты спосаб найбольш выкарысталі Латышы.

Ня толькі ў украінскім грамадзтве, але й сярод іншых ДП выклікала ўражаньне зачыненьне аднае з найбольш папулярных і баёва-антыбальшавіцкіх газэтаў «Українська Трибуна». Сама газэта зьвярнулася да грамадзянства з заклікам аб падтрыманьні. **Рэдакцыя «Бацькаўшчыны» із свайго боку выказвае сваю шчырую спагаду прыязнай рэдакцыі «Украінскай Трыбуны» і поўную гатовасьць падтрыманьня ў меру патрэбы й магчымасьці.**

Паранейшаму засталіся яшчэ без свае ліцэнзіяванае прэсы Казакі, Славакі, Каўказцы, а таксама наваарганізаваныя эмігранцкія нацыянальныя групы Баўгараў і Румынаў, ды нарэшце — найнавейшых эмігрантаў Чэхаў. Усім ім можам толькі шчыра пажадаць удачы ў захадах на здабыцьцё собскае ліцэнзіяванае прэсы.

### ЗАДУМАЛІ ВАЯВАЦЦА

Па ўсіх жыдоўскіх лягерах ДП прадстаўнікі Жыдоўскага Агенцтва праводзяць рэкрутацыю моладзі на змаганьне з Арабамі. Як бачым, Жыды не на жарт задумалі ваявацца.

* Пэўны лік кіраўнічых асобаў летувіскае калёніі Сао Паўлё, сярод іх адна жанчына, высланыя з Бразыліі за камуністычную дзейнасьць.

### МЫШКА МАЕ НАРАДЗІЦЦА...

**Вашынгтон (ДЭНА-ІНС).** Старшыня падкамісіі эміграцыйных справаў амэрыканскага кангрэсу Фэлёўз паведаміў, што кангрэс яшчэ ў гэтай сэсіі прыйме закон, які дасьць магчымасьць эміграваць у ЗША на працягу двух наступных год 200 тыс. ДП.

Законапраект павінен быць пададзены кангрэсу, калі падкамісія дойдзе да згоды ўва ўсіх пунктах. Фэлёўз выказаўся антымістычна пра прыняцьцё праекту абедзьвюма гасподамі кангрэсу й заявіў, што рэспубліканская бальшыня падтрымвае мерапрыёмствы й пасьля канчальнага распрацаваньня праекту правядзець пленарныя дэбаты.

На аснове праекту першым чынам павінна быць дазволеная эміграцыя 15 тыс. дзяцей-сіротаў, без залічэньня гэтага ліку да паасобных квотаў розных краёў. Асаблівыя перавагі пры эміграцыі будуць мець сельска-гаспадарскія работнікі, тэхнікі, санітаркі й зубныя лекары. У далейшай катэгорыі йдуць работнікі й краўцы. Апрача таго, асаблівыя перавагі павінны мець ДП, якія ўжо маюць сваякоў у ЗША.

### ЗАЯВА ДЫРЭКТАРА IPO

П. І. Эдуарус, дырэктар Галоўнае Гасподы IPO ў Гайдэльбэргу, зрабіў наступную заяву дзеля зьмяшчэньня ў прэсе:

«Я кагадзе прачытаў у газэце «Stars and Stripes» ад 1 сакавіка артыкул, у якім піша, быццам Галоўная Гаспода Амэрыканскае Арміі заявіла, што пасьля заканчэньня выдачы новых пасьветчаньняў ДП, праведзеная Арміяй сярод перамяшчэнцаў, якія праўна перабываюць у амэрыканскай зоне, IPO перайме адказнасьць за выключэньне зь лягераў жыхароў, якія ня маюць права жыць у лягерах.

У артыкуле піша, быццам гэтая пастанова была ўхваленая пасьля гутаркі між брыгадным генэралам Т. Л. Гаральдам, начальнікам аддзелу цывільных справаў, і мною.

Таму, што выраз «перайме на сябе адказнасьць» няправільны, я пачуваюся абавязаным ад імя IPO паправіць яго. Высяленьне няпрызнаных ДП становіць заданьне Арміі, а ня IPO. Тэрмін 21. 4. 1947 г., да якога ДП і ўцекачы мусілі жыць у ваднымъ зь лягераў, каб мець права й надалей там заставацца, — вызначаны на дамаганьне арміі. Такім парадкам, адказнасьць за якое-колечы высяленьне застаецца на арміі, і IPO ў ніякім выпадку ня будзе мець нічога супольнага з прымусовым высяленьнем.

У часе мае сустрэчы зь генэралам Гаральдам было ўстаноўлена, што ня будзе аніякага высяленьня, пакуль высяленым ня будзе забясьпечаная належная апека. Гэта адпавядае асноўным прынцыпам дзейнасьці IPO.

Адпаведна да нашае практыкі, як Кантрольнага Бюро ў часе высяленьня няпрызнаных ДП, мы маем рупіцца найперш аб тым, каб гэтыя людзі знайшлі належнае месца ў нямецкай гаспадарцы.

У часе гэтае сустрэчы таксама пастаноўлена, што між урадзьцамі сацыяльнае апекі трох нямецкіх краёў і Вайсковага Кіраўніцтва адбудзецца канфэрэнцыя і што адно па забясьпечаньні адпаведнае апекі пачнецца высяленьне жыхароў лягераў. Мы, із свайго боку, маглі-б даваць парады няпрызнаным скрыганым арміі ДП і спрыяваць перакананьню іх пакінуць лягеры; за гэтым мы не нясом ніякае адказнасьці і, упаасобку, ніякае адказнасьці за якое-колечы высяленьне».

НАТАЛЬЛЯ АРСЕНЬНЕВА

### Я — ЧАЛАВЕК

Я — чалавек... Усё людзкое,
Благое, добрае — ўва мне.
І боль людзкі мне сэрца кроіць,
А радасьць — кроў жвавей жане.
Як хвоі ў засенях сасонных
Зялёнай жменяю бяруць
І слоць, і сонца, й вецер з гоняў, —
І я ўсё, усё бяру:
Шматкі мэлёдый, крыўды, соладзь
Сустрэчаў лётных, зімаў золь,
І шум балёў, і боль, і голад,
І гнеў, вайстрэйшы за лязо.
Ўсё-хай адзін аккорд пявучы,
А парадзіла... Песьні я
Пляла і стоячы над кручай,
І там, на цёмным дне жыцьця.
І я ня каюся, што йдучы
Мяжой жыцьцёвай нацянькі
Ірвала ў ячмянёх калючых
Сабе на ўцеху васількі.
Хай іх няма, пялёсткаў сіня
Даўно зьлінала, і ў пяскох
Шляхоў забытых сьлед іх стыне, —
Яны былі мае! —
і ўсё.

### У СПРАВЕ ДЭВІЗАЎ

**Распараджаньне Галоўнае Гаспады Войска.**

Усе ДП, якія маюць дэвізы, мусяць здаць іх пад расьпіску ў Вайсковым Кіраўніцтве між 1—15 красавіка 1948 г. Амэрыканскія акупацыйныя ўлады паведамляюць, што гэтыя дэвізы будуць аддадзеныя собсьнікам перад іхным выездам зь Нямеччыны.

Падчыркваецца, што ДП падлягаюць усім пастановам закону № 53 Вайскавага Кіраўніцтва, аднак ім будзе дазволена забраць із сабою зь Нямеччыны ўсе дэвізы, якія яны маюць ды законным парадкам заявяць і здадуць.

У часе між 1 і 15 красавіком будуць зробленыя якнайдалейшыя палёгкі ўва ўсіх лягерах ДП, каб даць магчымасьць кажнаму выканаць распараджаньне Вайсковага Кіраўніцтва й здаць пад расьпіску дэвізы паводля закону № 53. Гэтаму закону падлягаюць:

а) Грашовыя знакі, за выняткам нямецкіх.

б) Чэкі, вэксэлі, дэвізавыя рахункі й іншыя аплатныя паперы, атрыманыя або выстаўленыя ад асобаў вонках Нямеччыны.

в) Страхаваньні або іншыя запісы на собскасьць ці даўгі, выстаўленыя:

1) асобамі вонках Нямеччыны або

2) асобамі ў Нямеччыне, калі яны выстаўленыя ў іншай, не нямецкай валюце.

г) залатыя й срэбныя манэты, срэбныя й плятынавыя кавалкі або стопы ў форме кавалкаў.

(Грошы амэрыканскае арміі, а таксама брытанскія й францускія акупацыйныя грошы й аліянцкія вайсковыя райхсмаркі не падлягаюць здаваньню).

Пасьля 15 красавіка 1948 г. закон № 53 Вайсковага Кіраўніцтва будзе праводзіцца якнайстражэй, і ўсе ДП, у якіх будуць знойдзеныя ў валоданьні або карыстаньні дэвізы, будуць судова адказваць за парушэньне закону № 53 Вайсковага Кіраўніцтва, а іхная собскасьць такога роду будзе сканфіскаваная.

---

М. СІНЬКЕВІЧ

## *Ключавое палажэньне* БЕЛАРУСІ *на ўсходзе Эўропы*

Беларуская Дзяржава, дзякуючы геапалітычнаму палажэньню на ўсходзе Эўропы, ад зары свае гісторыі аж да канца 18-га стаг., да свайго заняпаду, была найважнейшым гаспадарствам на ўсходзе Эўропы.

Займаючы цэнтральнае палажэньне ў Эўропе, Беларусь была даўгі час завальнаю брамаю, з аднаго боку для магутных мангола-татарскіх гордаў, а пасьля іхнага ўпадку — для задзіночаных сілаў маскоўскіх князтваў, і, з другога боку, устрымвала агрэсыўныя намеры свайго заходняга суседа — Польшчы.

Адным з довадаў высокае дзяржаўнае дасьпеласьці й зарганізаванасьці Беларусі можа служыць хоць-бы факт, што яна была адзіным краем на ўсходзе Эўропы, які здолеў стрымаць наступ мангола-татарскіх гордаў. Пэрыяд мангола-татарскае няволі абмінуў Беларусь не дзякуючы гістарычнаму выпадку і ня дзякуючы вялікай лясістасьці беларускіх этнаграфічных прастораў, як цьвердзяць некаторыя гісторыкі. Этнаграфічныя прасторы, скажам, суседняга Маскоўскага княства былі залесеныя ня ў меншай ступені, як прасторы Беларусі, аднак Масква ня стрымала магутнага напору войскаў Джынгіс-Хана й яговых славутных нашчадкаў. Мангола-татарскія горды рабілі неаднаразовыя спробы прарвацца ў цэнтральныя акругі беларускіх княстваў, але за кажным разам апошнія давалі ворагу належны адбой, дзякуючы высокай тагачаснай стратэгіі, вялікай вайсковай сіле, мужнай і скансалідаванай абароне беларускіх княстваў.

Галоўнай мэтай маскоўскае палітычнае думкі на працягу стагодзьдзяў была экспансія на захад і да апанаваньня Прыбалтыкі. Ужо за Іванам III Масква ператвараецца ў імпэрыялістычную дзяржаву. Пасьля разгрому Вялікага Ноўгараду, Іван III пастанавіў за ўсякую цану прабіцца да Балтыцкага мора, аднак не пачуваў сябе яшчэ нагэтульі дужым, каб здолець ужыцьцёвіць свае намеры. За царом Іванам IV паўстае новая літоўска-маскоўская вайна за Прыбалтыку, г. зв. Лівонская вайна, якая трывала зь перапынкамі ад 1558 да 1582 г. Вайна закончылася поўнай перамогай беларускіх войскаў над маскоўскімі, дармо, што па баку Масквы біліся крымскія Татары.

На гэтым месцы трэба прыпомніць, што гістарычны назоў «Літва» быў нацыянальным назовам беларускага народу аж да канца XVIII стаг. Расейскія цары, а асабліва Кацярына II, зь ведамых палітычных меркаваньняў, у імкненьні паняволіць Літву й далучыць яе да Маскоўшчыны, замянілі дзяржаўны назоў «Літва» на адміністрацыйны «Беларусь», а маскоўскаму народу даравалі імя «Русский», забараняючы яму карыстацца сваім гістарычным назовам «Масквіцяне». Такім парадкам ,прысабечаньнем маскоўскаму народу нацыянальнага украінскага народу, а наданьнем літоўскаму народу назову «Беларусь» справа задзіночаньня «рускіх зямель» магла ўважацца за закончаную.

Шмат чужынцаў і да апошняга часу не разумее яшчэ добра гэтак спрытна замаскаванае гістарычнае праўды й ідэнтыфікуе гістарычны назоў беларускага народу зь дзяржаўным назовам сяньняшняе Летувы. Сучасная этнаграфічная Летува была няхначнай часткай Вялікага Літоўскага Гаспадарства. Дзяржаўнай мовай Вялікага Княства Літоўскага была мова беларуская. Гэрб В.К.Л. — Пагоня — паходжаньня полацкага. Блізу ўсе гісторыкі й этнаграфы ня толькі беларускія, але расейскія й польскія, сьцьвярджаюць беларускасьць Вялікага Княства Літоўскага. Так, прыкладам, Мікола Кастамараў на балонах сваіх «Исторических монографий и исследований» І-шы том, С-Пецярбург 1863 г., піша: «Ліцьвін (пад гэтым назовам разумецца народ не запраўды літоўскі, а беларускі) — гэта нашчадак Крывічоў і Дрыгвічоў, названы агульным імём Ліцьвін». Польскі вучоны й гісторык А. Брыкнэр, у сваёй працы пад назовам «Руска-польскі рукапіс 1510 г.» (Slavia, VII—I, бал. 10-11) піша: «Кажам заўсёды — літоўскі, Ліцьвін, але гэта толькі замяж беларускі, Беларус, бо ў годзе 1510 нікому нічога пра Літву ўласьціўую этнаграфічную ані сьнілася, хутка Рэй у 1562 г. называў Ліцьвіном Беларуса, а ў Маскве і ў XVII в. литовский значыла гэтулькі, што беларускі». Просты народ расейскі, украінскі й польскі сумежных зь імі Беларусаў завуць па сяньняшні дзень Ліцьвінамі.

Гаворачы аб гістарычнай ролі Вялікага Княства Літоўскага на ўсходзе Эўропы, нельга ня ўзяць увагі на аднабаковае насьветленьне гістарычных фактаў польскімі й расейскімі гісторыкамі. Як адны, так і другія сьведама імкнуліся зьменшыць або абмінуць моўчкі вялікія заслугі беларускага народу перад заходняэўрапейскім сьветам. Так, прыкладам, толькі ад палавіны XIII-га й да канца XVII-га стаг. на Беларусь было зроблена каля 200 мангола-татарскіх рабунковых нападаў, а да XVII-га стагодзьдзя Беларусь вяла каля 15 вялікіх войнаў з Масквою. Гэтак Беларускае гаспадарства змагалася з Масквою аж да канца XVIII-га стаг., бароняччы ў бязупынных войнах свае ўсходнія межы, а адначасна з гэтым стрымваючы агрэсыўнаімпэрыялістычны наступ Масквы на захад і на паўночны захад — да Балтыцкага мора. Імкненьні нямецка-пруская ордэну прасунуцца на ўсход і паўдзённы ўсход з мэтаю каланізаваць гэтыя землі ня мелі таксама ўдачы. Кажнаразовыя іхныя спробы сустракалі моцны адпор беларускага народу. Нарэшце, у 1410 г. у ведамай біцьве каля Грунвальду супольнымі сіламі Вялікага Княства Літоўскага й Польшчы Крыжакі былі канчальна разгромленыя.

(Працяг будзе).

# Па куткох эміграцыі

### САКАВІК У ОСТЭРГОФЭНЕ

Нацыянальнае сьвята 25-га Сакавіка было вельмі ўрачыста адсьвяткаванае і ў беларускім лягеры ў Остэргофэне. Ураньні гэтага дня пад гукі песьні «Беларусь, наша Маці-Краіна», скаўтамі лягеру быў узьняты наш бел-чырвона-белы сьцяг. А 9-ай гадзіне адбылося ўрачыстае набажэнства ў лягернай царкве, якое адправіў праваслаўны сьвятар а. праф. М. Сьцяпанаў. Увечары-ж пры вялікім удзеле жыхароў лягеру прайшла ўрачыстая акадэмія, на якой, пасьля рэфэрату аб вялікіх падзеях 25 сакавіка 1918 г., быў дадзены канцэрт, які сваёй праграмай і мастацкім выкананьнем пакінуў вялікае ўражаньне сярод слухачоў. Галоўным удзельнікам канцэрту выступіў квартэт Беларускае Тэатральнае Студыі ў складзе М. Равенскага (іскрыпка), А. Каптуровіча (банджо), Д. Вераса (раяль) і М. Янчука (акардыён). Падбор інструмэнтаў сваім тэмбрам нязвычайны, а дзеля гэтага агульная гучнасьць дасягнула вялікае выразістасьці й арыгінальнасьці. Вельмі ўдала выйшла ў квартэту уверзтура з п'есьі «Вясёлы майстра» А. Кавалеўскага (музыка камп. М. Равенскага), якая, між іншага, неўзабаве будзе паказаная нашаму гледачу ня толькі ў Остэргофэне, але і ў іншых беларускіх лягерах. Пасьля квартэту наш ведамы кампазытар М. Равенскі выступіў у якасьці скрыпача-салістага. З выкананых ім нумароў на асаблівую ўвагу заслугоўвае пэама З. Фібіха, у якой выканаўца паказаў сваю тэхнічную й мастацкую дасканальнасьць. Ня менш цікавым быў выступ і сп. А. Каптуровіча, як салістага на банджо. Сваёй мякчынёй і кампактнасьцяй гучаньня ды выразнасьцяй выкананьне глыбака закранула пачуцьці слухача, асабліва яскрава гэта адчувалася ў творы нашага вялікага суродзіча М. Глінкі «Жаўранак». Піяністы Д. Верас, дармо, што меў дачыненьне зь неадпаведнае якасьці інструмэнтам, вельмі ўдала й памайстроўску выконваў фартап'янныя партыі ўсіх нумароў, што ўваходзілі ў праграму канцэрту.

На канчатак выступіў хор пад кіраўніцтвам М. Равенскага, які выканаў колькі нашых народных і нацыянальных песьняў, а таксама творы собскай творчасьці самога кампазытара.

Жыхары лягеру, што былі на акадэміі, пастанавілі ў дзень нашага найвялікшага нацыянальнага сьвята выслаць Прэзыдэнту Беларускай Народнай Рэспублікі Міколу Абрамчыку тэлеграму наступнага зьместу:

**«Яго Дастойнасьці Прэзыдэнту БНР Міколу Абрамчыку.**

**У дзень 30-ых угодкаў абвешчаньня дзяржаўнае незалежнасьці нашае Бацькаўшчыны шлём Вам, спадару Прэзыдэнт, нашыя найлепшыя пажаданьні плоднае працы й змаганьня да ўжыцьцёўленьня вялікага ідэалу 25-га Сакавіка.**

**Няхай жыве Прэзыдэнт Беларускае Народнае Рэспублікі Мікола Абрамчык!**

**Няхай жыве Рада і Ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі!**

**Няхай жыве вызваленая з бальшавіцкае няволі Вольная, Непадзельная й Незалежная Беларусь!»**

**Жыхар.**

**Ад рэдакцыі.** Аб вельмі ўдалым школьным ранішніку ў Остэргофэне пададзём асобна ў наступным нумары.

### НАЦЫЯНАЛЬНАЕ СЬВЯТА Ў ЛЯГЕРЫ МЭНХЭГОФ

Група Беларусаў у лягеры Мэнхэгоф вельмі ўрачыста абходзіла дзень нацыянальнага сьвята 25 сакавіка. Зраньня адбыўся малебен у мясцовай царкве. Удзень моладзь абходзіла хаты, раздаючы літаратуру й зьбіраючы ахвяры на Дапамаговы Камітэт. Кажны Беларус быў за гэта ўдэкараваны нацыянальнымі эмблемамі. Увечары адбылася ўрачыстая акадэмія з наступнай праграмай: адчыненьне, рэфэрат аб мінуўшыне й сучаснасьці Беларусі, прывітаньні, хор мясцовае пачаткавае школы. У часе акадэміі, пасьля ўшанаваньня памяці ўсіх, што аддалі жыцьцё за нашую народную справу, усе адсьпявалі наш нацыянальны народны гімн. Уканцы была прынятая наступная тэлеграма:

**«Яго Экселенцыі Прэзыдэнту Беларускае Народнае Рэспублікі М. АБРАМЧЫКУ.**

**Мы, Беларусы лягеру Мэнхэгоф і ваколіцы, сабраўшыся на ўрачыстую акадэмію ў дзень нашага Нацыянальнага Сьвята, пасылаем Вам, Спадару Прэзыдэнт, шчырыя пажаданьні ўсяго найлепшага ў вашай цяжкой і адказной працы. Пры гэтым абяцаем, што цьвёрда стаяць будзем пад нашым нацыянальным сьцягам за нашую Бацькаўшчыну, зямлю й волю.**

**Жыве Беларусь!» Дэмакрат.**

### ГОДНА АДСЬВЯТКАВАЛІ

Беларускі лягер Віндшыбэргердорф годна адсьвяткаваў 30-ыя ўгодкі 25-га Сакавіка. Увесь лягер быў упрыгожаны нацыянальнымі сьцягамі й зелянінай. Ураньні ў праваслаўнай царкве адбылося сьвяточнае набажэнства, на якім былі пасьвячаны скаўцкі сьцяг. Па набажэнсьцьве 60 скаўтаў зласкылі прысягу. А 4-ай гадз. дня ў лягернай залі, вельмі прыгожа ўдэкараванай, адбылася сьвяточная акадэмія. Пасьля рэфэрату аб Акце 25-га Сакавіка мясцовая пачатковая школа й дзеці зь дзіцячага садка далі захопліва патрыятычны канцэрт. Хор школы пад кіраўніцтвам настаўніцы Альшэўскае прапяяў каля 10 песьняў. Патрыятычныя вершы Я. Купалы, М. Багдановіча, А. Зязюлі й іншых нацыянальных паэтаў перамяжаліся з нацыянальнымі скокамі — лявоніхай, крыжачком, мяцеліцай. Цэнтральным нумарам праграмы быў мантаж Н. Арсеньневай «Родная мова». Усе ўдзельнікі канцэрту — вучні школы (каля 50) былі апранутыя ў нацыянальна вопраткі.

Акадэмія й канцэрт пакінулі вялікае ўражаньне. Заслугоўвае на пахвалу мастацкае афармаваньне залі й сцэны сп. Асіпчыкам і падрыхтаваньне праграмы канцэрту настаўніцай сп. Альшэўскай. **Сусед.**

### СЬВЯТОЧНЫ «НАПЕРАД»

Рэдакцыя атрымала № 7 часапісу «дванаццаткі» «Наперад», прысьвечаны 25-му Сакавіку. Як вонкавым выглядам, так і зьместам «орган дванаццаткі» выпростае ў паважны літаратурна-грамадзкі часапіс моладзі.

### «БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРНА-ПРАСЬВЕТНАЕ ТАВАРЫСТВА»

Усім добра ведама, што Беларусы — гэта народ мастацкае натуры, усе праявы жыцьця якога знайшлі выражэньне ў музыцы й песьні. Нашае народнае мастацтва, побач із роднай мовай, — гэта тая крыніца, якая праз сотні год паняволеньня не дала магчымасьці зьнішчыць нашае нацыянальнае аблічча й сяньня сьветчыць аб нашай культурна-духовай апрычонасьці.

Сяньня мастацтва — гэта найлепшы шлях да папулярызацыі нашае культуры, нашых ідэалаў і імкненьняў сярод іншых народаў.

6 сакавіка 1948 г. невялічкая група Беларусаў францускае зоны (галоўна гораду Заўльгаў) дала канцэрт, які быў прывітаны бурнымі воплескамі як суродзічаў, так і гасьцей іншых нацыянальнасьцяў (гл. аб гэтым у папярэднім нумары «Бацькаўшчыны». Рэд.).

Пасьля канцэрту сталася аж надта ясным, што ўжо надыйшоў час і магчымасьць мастацкае жыцьцё Беларусаў францускае зоны паставіць на арганізаваны шлях. І таго-ж самага вечару, зь ініцыятывы сп. Д., мастацкая ініцыятыўная група пастанавіла стварыць Таварыства, якое пакіравала-б культурна-прасьветнай працай беларускае эміграцыі францускае зоны. Назаўтрае была выпрацаваная заява й статут таварыства, якія неўзабаве будуць пададзеныя да агульнага ведама.

Францускія ўлады ўжо паінфармаваныя аб захадах ініцыятыўнае групы мастакоў і паставіліся прыхільна да новае арганізацыі.

Таварыства носіць назоў: «Беларускае Культурна-Прасьветнае Таварыства» і ставіць сабе за мэту згуртаваць мастакоў-Беларусаў з усіх галінаў мастацтва, арганізаваць канцэрты, вечарыны, паказы, рэфэраты, лекцыі, курсы й школы, папулярызаваць беларускае мастацтва, культуру й звычаі сярод іншых народаў і г. д. Наагул, каротка кажучы, Таварыства бярэць на сябе арганізацыю культурна-навуковае працы беларускага грамадзтва францускае зоны.

Із свайго боку можна толькі шчыра прывітаць ініцыятараў гэтага Таварыства і пажадаць ім запраўды ўдалае працы на культурна-мастацкай ніве.

**Барыс С.**

**Ад рэдакцыі.** Ужо пасьля набору карэспандэнцыі сп. Барыса С. рэдакцыя атрымала ананімны, нікім не падпісаны і без паказаньня асобы адпраўніка, друкаваны на машынцы дакумэнт, што быццам-бы паходзіць ад натаго самага Культурнага Таварыства з тае самае фрнцускае зоны й з таго самага г. Заўльгаў. Дакумэнт поўны далёкіх ад усякае культурнае працы выпадаў дробна-палітыканскага й асабістага характару ў парадку моднае ў некаторых колах кампаніі цкаваньня т.зв. «Крывічоў». Калі ад усяе душы можна прывітаць ініцыятыву да арганізаваньня культурнае працы ў францускай зоне, аб чым піша сп. Барыс С., дык адначасна нельга не перасьцерагчы нашых суродзічаў перад правакацыйнымі спробамі выкарыстаньня вялікае ідэі культуры й мастацтва дзеля шыльды для дробненькага палітыканства й асабістых парахункаў.

### СКЛІКАНЬНЕ НАЙВЫШЭЙШАГА КАЗАЦКАГА КРУГУ

Казацкае Народнае Прадстаўніцтва, як найвышэйшы рэпрэзэнтацыйны казацкі орган, гэтым даводзе да ведама ўсіх Казакоў, што ў 1948 годзе, у годзе тысячагоднага гістарычнага існаваньня Казацтва, склікаецца Найвышэйшы Казацкі Круг.

На разгляд Найвышэйшага Казацкага Кругу пастаўленыя ўсе надзённыя жыцьцёвыя пытаньні Казакоў, іхнае арганізацыі, існаваньня й адзінага казацкага ўзначаленьня.

Усім Казаком, што жывуць ува ўсіх краёх казацкага расьсяленьня й яшчэ не стварылі сваіх казацкіх арганізацыяў, прапануецца гэткія стварыць і зарэгістраваць іх у Казацкім Народным Прадстаўніцтве.

Усім выбарным прадстаўніком ад казацкіх палітычных, бытавых, грамадзкіх, культурных, прафэсійных і іншых арганізацыяў даецца права актыўнага ўдзелу ў Найвышэйшым Казацкім Крузе.

Месца й час паседжаньняў Найвышэйшага Казацкага Кругу будуць паведамленыя, з прычыны палітычных абставінаў, выбарным дэлегатам арганізацыяў, якія прадставяць сваіх выбарных Казацкаму Народнаму Прадстаўніцтву **не пазьней** як 1-га траўня 1948 г. на адрыс Казацкага Народнага Прадстаўніцтва: Нямеччына, Баварыя, гор. Мюнхен 22, Постфах 103.

Арганізацыі, што зь незалежных ад іх прычынаў ня здолеюць выслаць на паседжаньні Найвышэйшага Кругу сваіх выбарных дэлегатаў, маюць права да адзначанага тэрміну ў пісьмовай форме выказаць свае пастановы ўва ўсіх пытаньнях, што падлягаюць разгляду Найвышэйшага Казацкага Кругу.

**Казацкае Народнае Прадстаўніцтва.**

## КАМУНІКАТ № 3

**ЦЭНТРАЛЬНАЙ ВЫБАРНАЙ КАМІСІІ**
**для перавыбараў**
**БЕЛАРУСКАГА ЦЭНТРАЛЬНАГА ДАПАМАГОВАГА КАМІТЭТУ**
**ў Нямеччыне.**

Гэтым падаецца да агульнага ведама, што выбарная акцыя дзеля выбараў дэлегатаў на Зьезд Беларускага Цэнтральнага Дапамаговага Камітэту ў Нямеччыне, згодна дасюлешніх заяваў зь месцаў, праводзіцца памысна і ў бальшыні беларускіх лягераў і нацыянальных зарганізаваных групаў ужо закончылася. Цэнтральная Выбарная Камісія падае да ведама, што пасьля поўнага закончаньня выбараў адразу будзе вызначанае месца й тэрмін зьезду выбраных дэлегатаў дзеля перавыбараў кіраўнічых органаў Беларускага Дапамаговага Камітэту ў Нямеччыне.

**ЦЭНТРАЛЬНАЯ ВЫБАРНАЯ КАМІСІЯ**

## З БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

### НОВЫЯ МУЗЭІ Ў БССР

**Менск (БЕЛТА-Радыё).** У гарадох БССР ствараюцца новыя музэі, для іх падрыхтоўваюцца памешканьні, праводзіцца збор экспанатаў. У Мазыры арганізуецца краяведны музэй. Чатыры ягоныя аддзелы будуць прысьвечаныя партызанскаму руху на Палесьсі. Шмат цікавых экспанатаў набрана ў музэі аб паходзе праз БССР партызанскага злучэньня, якім камандаваў Каўпак (двойчы герой... рабаваньня жыхароў Беларусі). У гор. Кобрыне створаны гістарычны музэй.

У вёсцы Вязынь, Маладэчанскай акругі, закончанае аднаўленьне мэмарыяльнага музэю Янкі Купалы ў доме, дзе нарадзіўся паэта.

Ува ўсіх рэспубліканскіх, акруговых і раённых музэях рыхтуюцца вялікія выстаўкі на тэму «30-годзьдзе савецкае ўлады ў Беларусі».

### УСЁ ЎВЯНЧАЕ МАНУМЭНТ...

**Менск (БЕЛТА-радыё).** Кіраўніцтва справаў архітэктуры пры савеце міністраў БССР правяло зачынены конкурс на лепшы праект цэнтральнае плошчы г.р. Менску. Журы конкурсу прызнала за найболь прыемлівы калектыўны праект беларускіх архітэктараў Асмалоўскага й Кароль. Аўтарам яго ўдалося стварыць адзіны архітэктурны ансамбль.

Да плошчы будуць прылягаць будынкі савету міністраў БССР, драматычнага тэатру, прэзыдыюму вярхоўнага савету БССР. Усе будынкі ўвянчаюць манумэнт т. Сталіна (а ўжо-ж! Рэд.) і Вежа Перамогі.

Заслугоўвае на ўвагу калектыўны праект цэнтральнае плошчы сяброў-карэспандэнтаў Акадэміі архітэктуры Левінсона й Фаміна.

Кіраўніцтва архітэктуры распрацавала таксама 20 тыповых праектаў будаўніцтва жылых і грамадзкіх будынкаў для гарадоў БССР.

Складзены альбом праектаў селавых клюбаў. Альбом выдаецца масавым тыражом.

## ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

### СТЫПЭНДЫІ ССФ

Згодна із статутам ССФ пры ЦБСА, § 9 п.п. 5 і 6, паведамляем, што на 2-я паўгодкі (ад 1. 4. да 30. 9. 48 г.) прадбачацца наступныя стыпэндыі:

I кат. (аплата за навуку + 100 н. м. на месяц) — 15 стыпэндыяў.

II кат. (аплата за навуку + 50 н. м. на месяц) — 10 стыпэндыяў.

III кат. (толькі аплата за навуку) — 5—10 стыпэнд.

Агулом 30—35 стыпэндыяў на суму 18—20 тыс. н. м.

Пры гэтым прыпамінаем, што заявы павінны быць зложаныя да 20. 4. 48 г. (гл. паведамл. Управы ССФ у № 3 (6) «Бацькаўшчыны» за 8. 2. 48 і ў № 12 (24) «Шляхам Жыцьця» ад сьнежня 1947 г.).

**Управа ССФ пры ЦБСА.**

### ПАМОГА СТУДЭНЦТВУ

Сп. А. Сакалоўскі (Эльванген) пераказвае праз пасярэдніцтва «Бацькаўшчыны» пятнаццаць (15) марак на памогу студэнцтву.

## ШУКАЮЦЬ...

**Кошт абвесткі — па аднэй марцы за кажнае паасобнае слова. Аплата наперад.**

**Іру М. і Людмілу Х.,** ад 1942 да 1945 г. працавалі ў Судэтах пад адрысам Osm. Baumann Mühle Khan № 9 p. Obernitz Kr. Brüx. Весткі на адрыс «Бацькаўшчыны».

**Сьцяпана, Надзю й Івана Шэўчукаў** з Альбы, Касаўшчына — Шэўчук Язэп. Весткі на адміністрацыю «Бацькаўшчыны».

Сыноў **Дубіна Івана й Мікалая,** нар. 1923 і 1926 г. г. — маці Дубіна Анастася. Весткі на адміністрацыю «Бацькаўшчыны».

**Кузуру Міхала, Тарасэвіч Кацярыну, Бондараву Аляксандрыну, Кузуру Ганну** — Дронская Вольга. Весткі на адрыс: Kiel Fridrichsort, Ukrainisches Lager 40, An der Schanze, Olga Dronska.

Маці **Дуброўскую** Аляксандру й сёстраў Люсю й Вольгу — Сяргей. Весткі на адміністрацыю «Бацькаўшчыны».

Whiteruthenian Newspaper „The Fatherland"
Authorized by Headquarters European Command Civil Affairs Division A P O 757, A. G. 383, 7 GEC-AGO.
Administration — (13b) Osterhofen, Ndby., Whiteruthenian D. P. Camp.
Printed by: Hils & Maier, Dingolfing, Bruckstraße 99.